мовані на дискредитацію, зокрема, і української діаспори як колаборантськи налаштованої до фашистського режиму Німеччини спільноти.

А між тим, саме українська діаспора послідовно культивувала ідею суверенності України в усіх перипетіях бурхливого XX століття. Прагнення до волі завжди знаходили відгук у колах емігрантів Європи і США, Австралії і Канади тощо. З яким піднесенням діаспора зустріла українську незалежність, проголошену у 1991 році! Ще напередодні цієї події, коли виник Народний рух України за перебудову, якому у 2014 році виповнюється 25 років, діаспоряни активно підтримували цю громадянську ініціативу. Тоді, чверть століття тому, талановиті, інтелектуальні, патріотично налаштовані сили згуртувались довкола ідеї відродження України як нової цивілізованої демократичної держави. Подією історичної ваги стали їх виступи на першому установчому з'їзді Руху. Відомий діаспорний учений-історик Т. Гунчак так писав про ті незабутні дні у Києві: «…виступи головних промовців на з'їзді були тріюмфом українського інтелекту. Я слухав ці промови і дивувався, що такі великі особистості могли вирости в радянській системі» [4, с. 8]. І далі: «Мабуть, найважливіше те, що Установчий з'їзд виявив життєдайні сили, які здібні повести народ до нового відродження України як рівноцінної держави. З'їзд і створення Народного руху за перебудову, без сумніву, зворотний пункт в історії України… З'їзд породив Рух, перед яким світле й велике майбутнє» [4, с. 9].

Україна, отримавши незалежність у 1991 р., широко використовувала теоретичні, аналітичні та ідеологічні розробки інтелектуалів діаспори. Фактично саме наукові праці О. Бочковського про націю та її творення, Д. Донцова по ідеології націєтворення та державного будівництва, В. Липинського та Ю. Липи про сутнісне наповнення державно будівного націоналізму та про історичні аналогії українського державотворення, М. Шлемкевича про причини поразки державницьких змагань українців початку XX ст. та українську людину як суб'єкта національно-визвольних змагань, С. Кульчицького, Н. Григоріїва та Ю. Русова про відмінність українського менталітету від російського та вплив цих особливостей на державотворення [3], багатьох інших дослідників та інтелектуалів – представників політичної діаспори стали теоретичною та ідеологічною підставою для розбудови сучасної української незалежної держави на початках її проголошення.

І сьогодні відомі громадські діячі української діаспори активно підтримують євроінтеграційний вибір України. Так Аскольд Лозинський, описуючи свої враження від Євромайдану, зазначав: «Насправді, як з'ясувалося, ця революція за людську та національну гідність. …Гідність означає жити як європеєць. Це означає позбавитися від російського гноблення…» [6].

О. Пахльовська, одна із найвизначніших українських інтелектуалок, науковців та діячок, яка проживає та працює в Італії, аналізуючи події в Україні з позицій філософії Свободи, стверджує, що Україна своєю сутністю є європейською спільнотою, бо Європа тим і відрізнялась завжди від неєвропи, що боротьба за свободу як спільну, так і індивідуальну була стрижнем, внутрішнім рушієм її життя. Тому і сьогодні таким важливим є український порив до наповнення реальним змістом, свободою, буття українців у всіх його формах [8].

Вочевидь, така підтримка Єврореволюції, прагнень українських громадян до утвердження права власної окремішньої суверенної держави на повноцінне існування у сучасному світі, наповнення процесу сучасного українського державотворення справді конструктивним змістом, є логічним результатом докладених зусиль всього світового українства, що були спрямовані на боротьбу за відродження незалежної, самостійної, демократичної, цивілізованої держави на теренах України.

**1**. *Галайчук Б.* Нація поневолена, але державна / Б. Галайчук. – Мюнхен: Вид-во «Сучасна Україна», 1953. – 100 с. **2**. *Грабовська І.* Українська діаспорна інтелігенція як предмет філософсько-світоглядного аналізу (на прикладі життєдіяльності Олени Теліги) / Ірина Грабовська // Українознавчий альманах. Вип. 7. – К.: б/в, 2012. – С. 169–171. **3**. *Грабовська І.* Ментальні характеристики українців у творчій спадщині Юрія Липи / Ірина Грабовська // Шості Липівські читання. Матеріали Всеукраїнської наукової конференції. – К.: Українська видавнича спілка ім. Ю. Липи, 2012. – С. 14–19. **4**. *Гунчак Т.* Незабутні три дні в Києві / Тарас Гунчак // Сучасність. – Мюнхен, грудень 1989. – Ч. 12 [344]. **5**. *Лівицький М.* Відносини Захід-Схід і проблеми поневолених Москвою націй / М. Лівицький. – Мюнхен: б/в, 1975. **6**. Лозинський Аскольд С. Революція гідності / Аскольд С. Лозинський // Український погляд. – 20 грудня 2013, Нью Йорк. – [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://ukrpohliad.org/blogs/revolyutsiya-gidnosti.html. **7**. *Масловський В.* З ким і проти кого воювали українські націоналісти в роки Другої світової війни / В. Масловський. – М.: Славянский диалог, 1999. – 271 с. **8**. *Пахльовська О.* Про свободу і Радіо Свобода / Оксана Пахльовська [Електронний ресурс]. – Режим доступу: http://www.radiosvoboda.org/media/video/26543528.html. **9**. *Піскун В.* Політичний вибір української еміграції (20-ті роки XX століття): Монографія / Валентина Піскун. – К.: «МП Леся», 2006. – 672 с. **10**. *Полтава П.* Концепція самостійної України і основна тенденція політичного розвитку сучасного світу / П. Полтава // Україна проти Москви. – Бібліотека Українського Підпільника. Ч. 2. – Б/м: Вид-во Закордонних Частин Організації Українських Націоналістів, 1955. – С. 251–314. **11**. *Ребет Л.* Формування української нації / Лев Ребет. – Мюнхен: Вид-во «Сучасна Україна», 1951. – 59 с. **12**. *Стецько Я.* Рушійні кличі нашої боротьби / Ярослав Стецько // Україна проти Москви. – Бібліотека Українського Підпільника. Ч. 2. – Б/м: Вид-во Закордонних Частин Організації Українських Націоналістів, 1955. – С. 315–337. **13**. Страшний документ // Екран (Нью-Йорк). – 1985. – Рік XXIV, ч. 131–133. – С. 12.

УДК 94(476)+323.15(476)

*Ігар Пушкін*

## Украінская дыяспара Беларусі ў перыяд Навейшай гісторыі (1919–2009 гг.)

*У артыкуле раскрыты і прааналізаваны прадстаўніцтва, удзел і роля ўкраінцаў у кіруючых органах камуністычнай партыі, савецкай улады і эканомікі БССР (1919–1991 гг). Даследавана грамадска-палітычная і культурная дзейнасць украінскай дыяспары ў Рэспубліцы Беларусь (1991–2009 гг.). Разгледжаны мэты і праграмныя кірункі развіцця нацыянальных грамадскіх арганізацый украінцаў у Беларусі. Прааналізаваны грамадскія, культурныя і адукацыйныя мерапрыемствы. Зроблена высновa аб значнай ролі ўкраінцаў у сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыцці Беларусі, а таксама ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці.*

***Ключавыя словы:*** *Беларусь, украінская дыяспара, грамадскія арганізацыі ўкраінцаў*

*In article the representation and participation of Ukrainians in the governing bodies of the Communist Party, the state and the economic structure of the Byelorussian SSR (1919–1991) is shown and analyzed. Investigated the socio-political and cultural activities of the Ukrainian Diaspora of the Republic of Belarus (1991–2009). Goals and program orientations of the development of public associations of Ukrainians in Belarus are considered. Public and cultural events and educational activities are analyzed. It also contains a conclusion about significant role of Ukrainians in social, political and cultural life in Belarus as well as about their role in forming of civil society.*
***Keywords**: Belarus, Ukrainian Diaspora, Public Associations of Ukrainians*

Аналізуючы Навейшую гісторыю Беларусі (1919–2009 гг.), мы аглядаем гістарычны шлях народа Беларусі – беларусаў і нацыянальных меншасцей (у Канстытуцыі Рэспублікі Беларусь з 1994 г. ужываецца назва – нацыянальныя супольнасці), якія пражываюць сумесна на тэрыторыі краіны, асэнсоўваем віхуру рашучых перамен, што вызначалі іх лёс.

Паводле перапісу 2009 г. на тэрыторыі Беларусі пражывае крыху больш за 9,5 млн чалавек 135 нацыянальнасцей і народнасцей, сярод якіх вылучаюцца сваёй станоўчай роляю і высокім сацыяльным статусам прадстаўнікі братэрскага беларусам народа – украінцы. Немагчыма вывучыць гісторыю і культуру Беларусі без даследавання гісторыі і культуры ўкраінцаў, якія з’яўляліся нацыянальнымі меншасцямі на яе тэрыторыі і складалі істотную частку беларускага народа.

Аб’ект нашага даследавання – міжнацыянальныя адносіны. Прадмет – украінская дыяспара ў Беларусі. Намі прааналізаваны ўдзел і роля ўкраінскага насельніцтва ў жыцці беларускага народа ў перыяд Навейшай гісторыі Беларусі, ахарактарызавана дзейнасць украінскіх нацыянальных грамадскіх арганізацый.

Украінская дыяспара ў БССР у міжваенны час, з улікам тэрытарыяльных змен рэспублікі, была нешматлікай. Па перапісу насельніцтва ў 1926 г. налічвала 35 тыс. чалавек (0,6 % ад агульнай колькасці жыхароў). Сітуацыя змянілася пасля 1939 г. і ў пасляваенны час, калі ўдзельная вага ўкраінцаў у агульным складзе насельніцтва Беларусі складала прыкладна 2–3 %. Пачынаючы з 1960-х гг. яны знаходзяцца на 4 месцы пасля беларусаў, рускіх і палякаў: 1939 г. – 104,2 тыс. (1,9 %), 1970 г. – 190,8 (2,1 %), 1989 г. – 291,0 (2,9 %), 2009 г. – 158,7 (1,7 %) тыс. чалавек [11, с. 4, 306].

Прадстаўнікі ўкраінскага народа прынялі актыўны ўдзел у стварэнні Беларускай Народнай Рэспублікі, БССР. Так, актывісты ўкраінскіх арганізацый прагаласавалі за суверэнітэт БНР падчас прадстаўнічага сходу (удзельнічала каля 400 чалавек), які адбыўся 31.03.1918 г. у Магілёве па ініцыятыве Магілёўскага беларускага камітэта [7, арк. 1–26]. Восенню 1939 г. 53 украінцы (5,7 %) былі выбраны ў Народны сход Заходняй Беларусі. Калі адбывалася лёсавызначальнае для беларускага народа далучэнне Заходняй Беларусі да БССР, на 3-й пазачарговай сесіі Вярхоўнага савета БССР ад імя ўсяго насельніцтва Заходняй Беларусі прысутнічала ўпаўнаважаная камісія Народнага сходу, у склад якой уваходзілі і 2 дэлегаты-украінцы (усяго 66 асоб) [13, арк. 16–19].

У 1919–1990 гг. у БССР кіруючую ролю адыгрывала камуністычная партыя бальшавікоў (КП(б)Б). У даваенны перыяд у яе складзе, асабліва ў апараце кіравання, дамінуючую ролю адыгрывалі не беларусы, а прадстаўнікі нацыянальных меншасцей. Яўрэі складалі не меней за 25 % усяго складу КП(б)Б, рускія і украінцы ад 13 да 29 %.

У 1920–1930-я гг. у БССР у месцах кампактнага пражывання нацыянальных меншасцей утвараліся нацыянальныя сельскія саветы. Сярод іх 7 украінскіх (Лукаедаўскі і Гдзеньскі Камарынскага раёну Гомельскай акругі, Акопскі Нараўлянскага раёну Мазырскай акругі і інш.). Дзейнічалі школы з украінскай мовай выкладання: 1927/1928 нав. год – 8, у 1930/1931 нав. годзе – 14.

На пачатак 1940 г. у Беластоцкай вобласці (у склад якой уваходзілі Гродна і значная частка сённяшняй Гродзенскай вобласці) сярод сакратароў першасных арганізацый КП(б)Б украінцаў было 3,7 %, больш было толькі рускіх, беларусаў і яўрэяў [14, арк. 137]. Гэта былі, на думку цэнтральных уладаў СССР, найбольш правераныя кадры, на якія ўскладалася непасрэдная праца па сацыялістычных пераўтварэннях у краі. У 1940 г. у Вярхоўны савет СССР і Вярхоўны савет БССР у заходніх абласцях БССР было выбрана 4 украінцы (2 % ад агульнай колькасці дэпутатаў).

У гады вайны 1941–1945 г. насельніцтва апынулася па розныя бакі. Значным быў унёсак украінцаў у барацьбу з гітлераўскімі акупантамі ў складзе савецкіх партызан і падпольшчыкаў Беларусі. Агульны лік партызан у гады вайны ў Беларусі – больш за 374 тыс. чалавек, з іх прыкладна 4 % украінскай нацыянальнасці. У структуры падпольных арганізацый украінцы складалі 3,6 % [3, с. 78].

З другога боку прадстаўнікі ўкраінскага народа ўваходзілі ў склад паліцэйскіх фарміраванняў на тэрыторыі Беларусі. У ліпені 1941 г. у Мінску быў сфарміраваны асобны паліцэйскі батальён службы парадку колькасцю ў 910 чалавек, які складаўся з вызваленых ваеннапалонных украінскай нацыянальнасці. У Магілёве аховай буйнейшага канцлагера ў горадзе – Лупалаўскага, займаўся «ўкраінскі» 51-ы ахоўны батальён. Па стану на 29.02.1944 г. начальніку СС і паліцыі «генеральнай акругі Беларусь» непасрэдна падпарадкоўваліся 5 украінскіх паліцэйскіх фарміраванняў (2239 чалавек) у Мінску, Гарадзішчы, Капылі, Слоніме, Лідзе [12, с. 322].

Нацыянальная палітыка германскіх акупантаў актывізавала грамадска-культурную дзейнасць украінскага насельніцтва ў Беларусі. Можна адзначыць актыўную і плённую дзейнасць культурна-асветніцкага таварыства «Просвіта», развіццё ўкраінскага тэатра, клубаў і гурткоў, нацыянальнага друку. Імкненне да самавызначэння ўкраінскага народа выклікала рост напружання і варожасці паміж акупантамі і ўкраінскім насельніцтвам на апошнім этапе акупацыі.

На тэрыторыі Украінскага і Беларускага Палесся з 1933 г. дзейнічала падпольная арганізацыя «Украінскае нацыянальнае адраджэнне» (УНА). У чэрвені 1941 г. на базе падпольнай арганізацыі УНА было створана ўзброенае фарміраванне «Палеская Сеч Украінскай Паўстанцкай Арміі», якое найбольшы ўплыў у Беларусі мела на тэрыторыі Століншчыны. У паўднёвых раёнах Гомельскай і Брэсцкай абласцей дзейнічалі атрады Паўночнай групы Украінскай паўстанцкай арміі (УПА). У 1943 г. была ўтворана ваенная акруга «Тураў» пад камандаваннем Ю. Сцельмашука. У яе склад таксама ўваходзілі некаторыя раёны Брэсцкай, Пінскай і Палескай абласцей. З лета 1943 г. у паўднёвай частцы Беларусі дзейнічалі часткі Арганізацыі украінскіх нацыяналістаў (АУН). У ліпені 1944 г. яны былі аб’яднаны Брэсцкім акруговым «провадам» пад кодавай назвай «Крычаўскі», які ўзначальваў З. Саўчук [1, с. 300]. Летам 1944 г. на тэрыторыі Беларусі падпольныя фарміраванні АУН-УПА налічвалі прыкладна 12–14 тыс. чалавек. Напрыканцы 1944 г. на тэрыторыі Брэсцкай вобласці дзейнічала 120 невялікіх атрадаў (па 7–10 чал.), а ў Пінскай вобласці – 114 атрадаў, колькасны склад якіх быў ад 25 да 500 чал. Найбольш упартая барацьба вялася ў Дзівінскім раёне

Брэсцкай вобласці, дзе ва УПА ўваходзілі ад 2 да 3 тыс. чалавек [16, с. 303].

Для пасляваенных дзесяцігоддзяў у БССР было характэрна змяншэнне колькасці беларусаў. Гэта адбылося ў выніку розных прычын: перасяленні, рэпрэсіі і інш. Толькі з 1950 па 1960 г. з Беларусі ва ўсходнія раёны СССР (Сібір, Казахстан і інш.) па арганізаванаму набору рабочай сілы выехала прыкладна 900 тыс. чалавек. Гэта стварыла ўмовы для заняцця пасадаў прыезджымі (небеларусамі). У БССР павялічылася колькасць прадстаўнікоў рускага, пальскага і ўкраінскага народаў (рускіх прыкладна ў два разы і дасягнула амаль 1 млн чал., ці 10,4 %). Працэс папаўнення іншанацыянальнымі элементамі штатаў дзяржаўных і грамадска-палітычных структур ці сфер культуры, навукі, народнай адукацыі і г. д. адбываўся двума шляхамі – праз цэнтралізаванае размеркаванне, каб забяспечыць кіруючыя пасады савецкімі і партыйнымі кадрамі, адданымі савецкай дзяржаве і камуністычнай партыі, і добраахвотны прыезд людзей.

У пасляваенны перыяд даволі шмат украінцаў было ў кіруючых партыйных і выканаўчых органах улады, якія аказвалі адчувальны ўплыў на савецкае і гаспадарчае будаўніцтва БССР.

Фармальна вышэйшым органам улады ў рэспубліцы лічыліся з’езды КПБ. Аналіз нацыянальнага складу дэлегатаў з’ездаў дазваляе нам казаць аб тым, што прадстаўніцтва на з’ездах мясцовых камуністаў украінскага паходжання было стабільным і прыкладна ў 2–3 разы большае, чым іх вага сярод усіх жыхароў рэспублікі [17]. Гэта вынік таго, што ўдзельная вага ўкраінцаў у складзе КПБ істотна перавышала іх вагу ў складзе насельніцтва Беларусі. Колькасць украінцаў у складзе партыі вырасла з 1502 чалавек у 1945 г. да 28695 у 1985 г., або амаль у 19,1 раза, пры павелічэнні агульнай колькасці членаў КПБ у 22,2 разы. У 1945 г. удзельная вага ўкраінцаў у складзе КПБ склала 5,08 %, у 1985 г. зменшылася да 4,37 %, а ў 1990 г. яна была на ўзроўні 4,5 %.

У 1955 г. на пасадах кіруючых кадраў КПБ з агульнага ліку 5223 працавалі 298 украінцаў, што складала 5,7 %, а ў наменклатуры ЦК КПБ удзельная вага ўкраінцаў склала 4,45 %. У аддзеле навукі і культуры ЦК яна складала 5,74 %, у сельскагаспадарчым аддзеле – 8,01 %. На пачатак 1975 г. пасаду аднаго з пяці сакратароў ЦК КПБ займаў украінец. У 1985 г. украінцы ўзначальвалі 3 з 32 сектараў ЦК КПБ, або 9,37 % [6, с. 313]. Сярод апарату абкамаў, гаркамаў і райкамаў украінцы былі прадстаўлены, пачынаючы з пасады загадчыка аддзела гаркама і райкама і да загадчыка аддзела абкама КПБ. Праўда, сакратарамі абкамаў 2 украінцы былі толькі ў 1971 г.

Сярод кіруючага савецкага апарату БССР украінцы былі сярод старшынь і намеснікаў старшынь гарвыканкамаў і вясковых райвыканкамаў. З сярэдзіны 1970-х гг. на ўзроўні непасрэднай працы выканаўчых органаў улады з жыхарамі вага украінцаў складала ад 4,9 % у 1981 г. да 2,8 % у 1990 г. На больш высокім узроўні мясцовай улады (намеснікі і першыя намеснікі старшынь аблвыканкамаў) па 1 украінцу было толькі ў 1989–1990 гг. [9]. 15 асоб украінскай нацыянальнасці былі выбраны ў склад Вярхоўнага Савета БССР ў 1985 г.

Украінцы былі добра прадстаўлены і ў гаспадарчай эліце БССР. Напрыклад, у 1984 г. прадстаўнікамі ўкраінскага народу былі: генеральны дырэктар вытворчага аб’яднання Міністэрства трактарнага і сельскагаспадарчага машынабудавання, па 2 дырэктары мясакамбінатаў і абутковых фабрык, 6 упраўляючых будаўнічымі трэстамі ў Віцебскай, Гомельскай, Мінскай абласцях, 4 начальнікі геафізічных, геолагавыведачных і пашукова-здымачных экспедыцый, 2 начальнікі нафтагазаздабываючых упраўленняў, 26 старшынь калгасаў, 28 дырэктароў саўгасаў, 5 начальнікаў міжраённых упраўленняў па меліярацыі, 5 старшынь саветаў раённых аграпрамысловых аб’яднанняў [15].

Украінцы займалі высокія статусныя пазіцыі ў культуры і навуцы рэспублікі, чаму спрыяў іх адукацыйны ўзровень. У 1979 г. асобаў украінскай нацыянальнасці з вышэйшай і сярэднеспецыяльнай адукацыяй было 392 тыс., з іх 180 тыс. з вышэйшай; у 1989 г. адпаведна 476 тыс. і 222 тыс. У БССР сярод украінцаў увесь час павялічвалася колькасць такіх сацыяльных катэгорый, як навукова-тэхнічная інтэлігенцыя, настаўнікі, урачы, работнікі культуры і мастацтва [4, с. 29–30].

У 1960 г. удзельная вага ўкраінцаў, што займалі пасады загадчыкаў гарадскіх і раённых аддзелаў культуры, павялічылася да 10,5 %. Са 172 загадчыкаў раённых аддзелаў народнай адукацыі было 5 украінцаў, або 2,9 %, а ў 170 раённых і гарадскіх аддзелах культуры загадчыкамі працавалі 11 украінцаў, што склала 6,4 %.

У складзе навуковых работнікаў Беларусі ў 1960 г. было 10 дактароў і 81 кандыдат навук украінскай нацыянальнасці, у 1970 г. адпаведна 20 і 310, у 1987 г. – 56 і 818 чалавек. У канцы 1980-х гг. украінцы складалі 5,95 % навуковых работнікаў рэспублікі. Больш як 10 % ад агульнай колькасці спецыялістаў з вышэйшай адукацыяй складалі ўкраінцы ў Тэатральна-мастацкім інстытуце, Брэсцкім інжынерна-будаўнічым, Мінскім радыётэхнічным інстытутах і Мінскім палітэхнічным тэхнікуме [6, с. 313–314].

Значны ўклад у развіццё беларускай навукі ўнеслі ўкраінцы – доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар, акадэмік АН БССР, загадчык лабараторыі тэорыі канцавых груп Інстытута матэматыкі (Гомельскае аддзяленне) С. Чуніхін (1905–1985), доктар фізіка-матэматычных навук, прафесар БДУ (1991–1998), узнагароджаны медалём Лабачэўскага «За выдатныя працы ў вобласці геаметрыі» Б. Камракоў, кандыдаты фізіка-матэматычных навук, дацэнты – загадчык кафедры алгебры ГрДУ (1978–1983) В. Аўчыннікаў, супрацоўнік кафедры прыкладной матэматыкі ГрДУ Ю. Белых, выкладчык кафедры алгебры і методыкі выкладання матэматыкі ВДУ імя П. Машэрава В. Сементоўскі [2, с. 327–328] і іншыя.

У 1970–1980-я гг. у БССР хуткімі тэмпамі ішоў працэс рускамоўнай асіміляцыі прадстаўнікоў іншых нацыянальнасцей. Так, згодна перапісу 1979 г., рускую мову, акрамя 1116,5 тыс. рускіх, назвалі роднай у гарадах 54,5 % украінцаў, 55 % армян, 56 % латышоў, 80,3 % яўрэяў. Частка мясцовых украінцаў добра засвоілі культуру, мову і звычаі беларусаў і рускіх таму сталі лічыць сябе беларусамі ці рускімі. Імкненне ўладаў СССР да поўнай саветызацыі і русіфікацыі рабілі вельмі сумнiўнымі перспектывы захавання і развіцця беларускай і ўкраінскай культур на беларускай зямлі. Перад імі паўставала задача: змірыцца з наяўным становішчам ці пайсці па шляху адраджэння. У перыяд дэмакратызацыі грамадскага жыцця напрыканцы 1980-х – пачатку 1990-х гг. у Беларусі сталі ўзнікаць нацыянальныя грамадскія арганізацыі, у тым ліку і ўкраінскія.

Першым было створана ў студзені 1991 г. рэспубліканскае Беларускае грамадскае аб’яднанне (ГА) украінцаў «Ватра». З 1995 г. бярэ пачатак дзейнасць ГА «Цэнтр украінскай культуры «Січ» у г. Мінску. Аб’яднанні былі ўтвораны з мэтай: садзейнічаць захаванню і развіццю ўкраінскай культуры, самаідэнтыфікацыі ўкраінскага этнаса ў Рэспубліцы Бела-

русь, спрыяць фарміраванню нацыянальнай самасвядомасці, гістарычнай памяці, стварэнню ўмоў для нацыянальна-культурнага развіцця.

У пачатку XXI ст. ГА «Ватра» каардынавала работу: грамадскай арганізацыі ўкраінцаў «Радзіслаў» (г. Віцебск), культурна-асветніцкіх таварыстваў «Верхавіна» (г. Гомель), «Краяны» (г. Маладзечна), «Обрій» (г. п. Калодзішчы, Мінскі р-н), «Заповіт» (г. Мінск), «Славуціч» (г. Бабруйск), грамадскага аб'яднання ўкраінцаў «Дніпро» (г. Магілёў), аб'яднання ўкраінцаў «Барвінак» (Гродна).

ГА «Цэнтр украінскай культуры «Січ» праводзіў розныя культурна-асветніцкія мерапрыемствы, сярод якіх асобна варта адзначыць прадстаўнічыя і змястоўныя V і VI рэспубліканскія фестывалі мастацтваў украінцаў Беларусі (1999, 2002 гг.). Аўтарытэт і вядомасць цэнтру сярод іншых дадавалі: Н. Калюска – выхавацель, заслужаны работнік культуры Украіны, В. Логвін – кандыдат навук, дацэнт, загадчык кафедры БДАФК, узнагароджаная ордэнам Украіны «За заслугі» III ступені, І. Дмухайла – заслужаны работнік культуры Беларусі, член Саюза мастакоў Рэспублікі Беларусь і інш.

Украінская мова вывучалася ў дзвюх сярэдніх школах горада Брэста, а таксама факультатыўна і ў гуртках у Кобрыне, Драгічынскім раёне. У Брэсцкім дзяржаўным універсітэце вялася падрыхтоўка спецыялістаў з кваліфікацыяй філолаг, выкладчык рускай і ўкраінскай мовы і літаратуры.

У 1996 г. быў утвораны ў г. Брэсце Украінскі навукова-педагагічны саюз Беларусі «Берагіня». Мэта аб'яднання – яднанне педагагічных, навуковых і культурных дзеячаў Беларусі ў справе развіцця сістэмы ўкраінскай адукацыі, вывучэння ўкраінскай мовы, культуры, народнай творчасці і нацыянальных традыцый ураінцаў. Сярод сяброў саюза найбольш вядомыя і аўтарытэтныя: Л. Дарашко – кандыдат філалагічных навук, загадчык аддзялення ўкраіністыкі БрДУ імя А. Пушкіна, Л. Нікалайчук – прафесар кафедры медыцынскіх ведаў, паэтка, А. Мароз – кандыдат фізіка-матэматычных навук, дацэнт Брэсцкага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта і інш. Да найбольш значных мерапрыемстваў «Берагіні» за 1999–2004 гг. варта аднесці падрыхтоўку і выданне вучэбных дапаможнікаў – Дорошко Л. С. Початковий курс української мови. Фонетика. – Брест, 2000; Дорошко Л. С. Практичний курс української мови (Лексика). – Брест, 2004 [10, с. 88–90].

На тэрыторыі Брэсцкай вобласці дзейнічалі грамадскае аб'яднанне «Прасвіта Берасцейшчыны» імя Т. Шаўчэнкі і Украінскае грамадска-культурнае аб'яднанне Брэсцкай вобласці, выдаваліся газеты «Берасцейскі край» і «Голас Берасцейшчыны». Варта адзначыць, што некаторыя з іх кіраўнікоў неаднаразова бяздоказна абвінавачвалі ў надрукаваных матэрыялах Рэспубліку Беларусь у прымусовай асіміляцыі і дыскрымінацыі ўкраінцаў, тым самым ствараючы падставы для ўзнікнення міжнацыянальнай напружанасці. Не адмаўляючы наяўнасць праблем украінскай этнічнай супольнасці на тэрыторыі Брэсцкай вобласці, дзейнасць падобных арганізацый насіла не канструктыўны характар.

З 2001 г. у Рэспубліцы Беларусь выдаецца газета на ўкраінскай мове «Українець у Білорусі» пад эгідаю ГА «Ватра» і Камітэта (апарата Упаўнаважанага) па справах рэлігіі і нацыянальнасцей.

Украінскія грамадскія аб'яднанні Беларусі праводзілі значную культурна-асветніцкую работу, пастаянна ўдзельнічалі ва Усебеларускіх фестывалях нацыянальных культур, захоўваючы нацыянальныя традыцыі і культуру ў асяродку сваёй нацыянальнай супольнасці і прапагандуючы яе сярод насельніцтва Рэспублікі Беларусь.

Спрыяе плённай дзейнасці грамадскіх арганізацый украінцаў у Беларусі пагадненне паміж Рэспублікай Беларусь і Украінай аб супрацоўніцтве ў забеспячэнні правоў асоб, якія належаць да нацыянальных меншасцей (1999 г.), а таксама Закон «Аб нацыянальных меншасцях у Рэспубліцы Беларусь». Апошні быў прыняты ў 1992 г. пры актыўным удзеле ўкраінскай дыяспары. Так, Украінскае грамадска-культурнае аб'яднанне Брэсцкай вобласці прапаноўвала, каб у Законе быў прызнаны факт існавання і кампактнага пражывання ў Паўднёвым беларускім Палессі аўтахтоннага ўкраінскага этнічнага насельніцтва. ГА «Ватра» заклікала ўнесці ў Закон права на ўтварэнне ў месцах кампактнага пражывання нацыянальных груп, якія складаюць большасць насельніцтва дадзенай мясцовасці, нацыянальных адміністратыўна-тэрытарыяльных адзінак, права на вылучэнне кандыдатаў у дэпутаты па асобных спісах нацыянальных супольнасцей [8, арк, 12–14] і інш.

Усхвалявалі ўкраінцаў Беларусі і падзеі 2013–2014 гг. ва Украіне. Кіраўнік культурна-асветніцкага аб'яднання ўкраінцаў Магілёва Г. Гузій вітаў замірэнне на Данбасе і адзначыў выключную ролю ў гэтым Беларусі (на мове публікацыі): «*І гэта ўсё дзякуючы Беларусі і асабіста Аляксандру Рыгоравічу Лукашэнку, што менавіта ў Менску падпісваюцца пагадненьні. У сяброўскай нам краіне. Усё правільна, нам замірэньне патрэбнае. Радуе і тое, што Расея робіць хоць нейкія крокі да замірэньня. Кавалак Данбасу яны ўжо адхапілі – гэта, відаць, як для іх, то па-суседзку. Крым адхапілі. Ну, хоць цяпер спрабуюць замірыцца, і гэта радуе*». Што да самой Украіны і ўкраінцаў, то спадар Гузій заявіў: «*Украіна ляжа ўся, але пад ярмо расейскіх бандытаў ніколі больш ня пойдзе*…» [5].

Такім чынам, на тэрыторыі Беларусі ўкраінцы разам з беларусамі прайшлі адзіны, шмат у чым цярністы шлях, маюць нямала агульных нацыянальных герояў, пісьменнікаў, кампазітараў, грамадска-палітычных і дзяржаўных дзеячаў і г. д. Украінцы Беларусі зведалі працэсы асіміляцыі і інтэрнацыяналізацыі, але захавалі сваю самабытнасць. Аналіз грамадска-палітычнай і культурнай дзейнасці ўкраінскай дыяспары ў Беларусі (1919–2009 гг.) дазваляе зрабіць выснову аб значнай ролі ўкраінцаў у сацыяльна-эканамічным, грамадска-палітычным і культурным жыцці беларускага народа, а таксама ў фарміраванні грамадзянскай супольнасці.

**1**. *Валаханович И. А.* Деятельность спецгрупп НКГБ БССР по выявлению и ликвидации подпольных структур ОУН–УПА на оккупированной территории Беларуси (1943–1944 гг.) / И. А. Валаханович // Беларусь-Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.). – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 297–300. **2**. *Зенькович Ю. В.* Вклад уроженцев Украины в развитие математической науки Беларуси в XX веке / Ю. В. Зенькович // Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.). – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 326–328. **3**. *Каваленя А. А.* Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы ў асяроддзі беларускіх партызан 1941–1944 гг. (па матэрыялах БШПР) / А. А. Каваленя, А. А. Калеснікава // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. – Мінск: БДПУ, 1998. – С. 77–90. **4**. *Курыловіч Г. М.* Украінцы на Беларусі / Г. М. Курыловіч // Нацыянальна-дэмаграфічныя працэсы на Беларусі: зб. нав. арт. – Мінск: БДПУ, 1998. – С. 22–30. **5**. Магілёўскія ўкраінцы – пра сытуацыю на сваёй гістарычнай радзіме [Электронны рэсурс] //

Навіны Радыё Свабода. – 2014. – 24 верасня. – Рэжым доступа: http://www.svaboda.org/content/article/26604217.html. **6**. *Мазец В. Г.* Роля ўкраінцаў у грамадскім і культурным жыцці Беларусі (1945–1989 гг.) / В. Г. Мазец // Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.). – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 312–315. **7**. Мандаты дэлегатаў сходу // Lietuvos centrinis valstybės archyvas. – Ф. 582. – Воп. 2. – Спр. 65. **8**. Матэрыялы да пасяджэння камісіі // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Ф. 968, воп. 1, спр. 4095. **9**. Нацыянальны склад савецкіх кадраў БССР. Справаздачы // НАРБ. – Ф. 4 п, воп. 156, спр. 767, 769, 969. **10**. *Пушкін І. А.* Нацыянальныя супольнасці Беларусі: грамадска-палітычная і культурна-асветніцкая дзейнасць (1990–2005 гг.): манаграфія / І. А. Пушкін. – Магілёў: МДУ імя А. А. Куляшова, 2007. – 206 с. **11**. *Пушкін І. А.* Удзел нацыянальных меншасцей у грамадска-палітычным жыцці Савецкай Беларусі (1919–1990 гг.): манаграфія / І. А. Пушкін. – Мінск: Выд. цэнтр БДУ, 2010. – 319 с. **12**. *Саракавік І. А.* Гісторыя Беларусі ў кантэксце сусветнай гісторыі / І. А. Саракавік. – Мінск: «Современная школа», 2006. – 456 с. **13**. Склад дэлегатаў упаўнаважанай камісіі народнага сходу Заходняй Беларусі // Дзяржаўны архіў грамадскіх аб'яднанняў Гродзенскай вобласці (ДАГАГр). – Ф. 6195, воп. 1, спр. 230. **14**. Склад сакратароў першасных партарганізацый згодна нацыянальнасці ў Беластоцкай вобласці // ДАГАГр. – Ф. 6195, воп. 1, спр. 12. **15**. Статыстычныя справаздачы аб складзе кіруючых кадраў сельскай гаспадаркі БССР // НАРБ. – Фогд 4 п. – Воп. 151. – Спр. 43. – Воп. 156. – Спр. 50. **16**. *Стрелец М. В.* К вопросу об оценке деятельности украинских национальных организаций в годы Второй мировой войны / М. В. Стрелец, М. А. Коршак // Беларусь – Украіна: гістарычны вопыт узаемаадносін: Матэрыялы міжнар. навук. канф. (Мінск, 18–19 сакавіка 2003 г.). – Мінск: Інстытут гісторыі НАНБ, 2004. – С. 301–303. **17**. Стэнаграмы з'ездаў. Даклады мандатных камісій // НАРБ. – Фонд 4 п. – Воп. 2. – Спр. 213, 218, 225, 237, 239, 244, 248, 251, 257, 269. – Воп. 140. – Спр. 1. – Воп. 160. – Спр. 374, 1027, 1029.

УДК 327.58(=161.2)(1-87)

*Юлія Шахно*

## Концепція триангулярності діаспорального буття

*Сегментація діаспорального буття створює умови для більш детального дослідження екзистенційних, онтологічних проблем, що постають перед іммігрантом після відриву від континентального середовища. Тому розгляд цього явища за допомогою принципу «зміни масштабу» дозволить окреслити основні концепти проблеми.*

***Ключові слова**: діаспоральне буття, рівні діаспорного буття.*

*The segmentation of Diaspora being creates conditions for more detailed investigations of existentialistic and ontological problems which stand for an immigrant after his tearing off from the continental environment. That is why the research of this phenomenon according to the principle of «scale changing» let to draw the main concepts of this problem.*

***Keywords**: Diaspora Existence, Levels of Diaspora Existence.*

Кореляція між макро-, мезо-, мікрорівнями діаспорального буття детермінована особливостями розвитку сучасного суспільства. Його структурування відбувається в результаті зростаючої як горизонтальної так і вертикальної соціальної мобільності, що обумовлюється трансформаціями капіталізму та його переходом в «фазу глобалізації» (А. Воскресенський). Під «соціальною мобільністю» ми розуміємо «не тільки соціальне переміщення індивідів, груп, але й соціальних об'єктів (цінностей), тобто всього того, що створене чи модифіковано в процесі людської діяльності» [7, с. 14]. Переміщення людей, капіталів, інформації, стирання усталеного уявлення про кордони, спільноти породжує діалектичний зв'язок між процесами мікро- та макрорівнів. Проблема їх взаємодії, взаємопідпорядкування та породжені ними імплікації вносять у буттєвий простір іммігранта онтологічні та екзистенційні фрустрації. З одного боку, під впливом глобалізації відбуваються процеси інтеграції та подальшої уніфікації усіх сфер людського буття і він повинен пристосовуватись – «бути як всі», а з іншого, можемо спостерігати відцентрові тенденції – зростання сепарабельності, локалізації чи фрагментації, що породжує прагнення віднайти себе – «бути собою», творити «культуру себе». Саме тому перед філософами постає проблема більш детального дослідження екзистенційних основ діаспорального буття та виокремлення основних поведінкових механізмів іммігранта по відношенню до поліструктурного середовища, в межах якого він реалізує свою дієздатність як соціокультурний суб'єкт.

Розгляд багатоукладності діаспорального буття за допомогою «зміни масштабу» дослідження забезпечить повноту та глибину аналізу, дозволить корелювати між діалектичними категоріями одиничного та загального, об'єктивного та суб'єктивного, глобального та локального, що сприятиме окресленню основних концептів проблеми.

Соціально-економічні, онтологічні та екзистенційні виклики активізують людську рухливість – інтелектуальну, територіальну, матеріальну. Відриваючи та відчужуючи індивіда від корінного середовища, вони порушують усталену повноту «буття-тут-і-тепер». В історичній ретроспективі, явища, які привносять предикативні зміни у місцеві світи, іменують періодами «зламу» (С. Корнелл). Вакуум, що формується в результаті даного процесу надриву, руйнує усталений принцип буття і перетворює членів даної спільноти на споглядачів власного життя. Такі граничні ситуації змушують іммігранта або шукати щастя деінде, долаючи буттєвий ескапізм, або пускати коріння в іноетнічному суспільстві та вибудовувати нову стратегію співжиття з ним. За таких умов, породжена проблема «дихотомічної присутності може бути подолана діахронічним переосмисленням минулого, його переоцінкою та проекцією нових міфів. У такий час нестабільності новостворені наративи виступають вихідними для конструювання нової ідентичності. «Періоди зламу вимагають «ре-нарації, переповідання ідентичності», яка дає змогу спільноті інтегруватись у свій історичний наратив, новий досвід і переосмислити старий» [11, с. 45–46]. Застосовуючи даний принцип при диференціації новоутвореного соціального світу, який складається з ноуменальної реальності, що створюється найближчим оточенням іммігранта та його сучасниками, та символічної реальності, яка є агностичною щодо емпіричного знання індивіда про світ предків та його нащадків, можна стверджувати, що «людина не може бути одинокою, відірваною від інших людей. Її щастя залежить